# У Осла паляцяць "Матылькі"

## ДЗЕЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ НА "ЕЎРАБАЧАННІ-2010" ГРУПЕ "ТРЫ ПЛЮС ДВА" ЗМЯНІЛІ ПЕСНЮ

У Осла адбылася сустрэча кіраўнікоў дэлегацый краін — удзельніц "Еўрабачання-2010". У ходзе яе Белтэлерадыёкампанія, як член Еўрапейскага вяшчальнага саюза, прадставіла неабходны інфармацыйны пакет дакументаў групы "Тры плюс два", якая выступіць на міжнародным конкурсе за Беларусь. У тым ліку і новую песню.

25 мая ў выкананні квінтэта маладых салістаў са сцэны "Еўрабачання-2010" прагучыць кампазіцыя "Butterflies" ("Матылькі"), музыку да якой напісаў расійскі прадзюсар і кампазітар Макс Фадзееў на словы польскай паэткі Малькі Чаплін. "Матылькамі" ледзь не ў апошні момант вырашана было замяніць ранейшую выбраную для конкурсу песню "Far away" беларускіх аўтараў Леаніда Шырына і Юрыя Вашчука.

Кампазіцыя "Матылькі" напісана Максам Фадзеевым спецыяльна для групы "Тры плюс два". Прадзюсар сам выйшаў на тэлеканал АНТ, які сёлета займаецца арганізацыяй падрыхтоўкі прадстаўніка ад Беларусі на "Еўрабачанне", і прапанаваў свае паслугі. Крыху больш як за тыдзень была зроблена аранжыроўка, зняты кліп, прыдуманы нумар і распрацаваны новыя вобразы для салістаў. Дарэчы, на конкурсную сцэну з імі цяпер выйдзе яшчэ і шосты ўдзельнік — піяніст.

На думку першага намесніка старшыні праўлення ЗАТ "Другі Нацыянальны канал" Сяргея Хоміча, выказаную ім на прэс-канферэнцыі ў Мінску, праект "Тры плюс два" не стаў менш беларускім з-за таго, што для выканання на конкурсе для яго выбрана песня расійскага аўтара. Паводле яго слоў, у стагоддзе глабалізацыі ўжо даўно ніхто не робіць усё "пад ключ" у адной краіне. У дадзеным выпадку расійская кампазіцыя аказалася больш падыходзячай — удзельнікі групы маюць нахіл да класічнага выканання, і павольная песня "Матылькі", напісаная якраз у такой стылістыцы, дае магчымасць падкрэсліць галасавыя здольнасці кожнага з салістаў.

Разам з тым, адзначыў Сяргей Хоміч, гэта не значыць, што зробленае раней адправіцца ў карзіну. На "Еўрабачанне" маладая група паедзе не з адной песняй, а з альбомам з лепшых кампазіцый, якія спевакі выконвалі падчас удзелу ў праекце "Музычны суд", і двума кліпамі.

Вольга **Юрэвіч**

